www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

4 сакавіка 2005 года, № 5 (1913)

***Дарагія жанчыны!***

*Віншую вас з цудоўным святам! Менавіта ў гэты дзень мы, мужчыны, адчуваем да вас большую прыхільнасць, пяшчоту і любоў.*

*Жадаю вам заставацца такімі ж прыгожымі і разумнымі!*

***Рэктар БДУ Васіль СТРАЖАЎ***

**ВЕДАЙ НАШЫХ!**

# ПРЭЗІДЭНТ ПАДТРЫМЛІВАЕ АДОРАНЫХ

***Ушанаванне студэнтаў нашага універсітэта — лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, у тым ліку стыпендыятаў прэзідэнцкага фонду, пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх студэнцкіх алімпіяд, адбылося 28 лютага ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ.***

У цырымоніі прынялі ўдзел рэктар нашага універсітэта прафесар В.І. Стражаў і сакратар спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ніна Уладзіміраўна Пташнік.

Нагрудны знак "Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" і грашовую прэмію атрымалі пераможцы фінальных спаборніцтваў каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў 2004 года: другакурснікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Вікторыя Лебедзь і Максім Восіпаў, а таксама чацвертакурснік гэтага ж факультэта Іван Мяцельскі.




Грашовую прэмію і пасведчанне спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі пераможцы Рэспубліканскай студэнцкай алімпіяды па матэматыцы 2004 года — студэнты механіка-матэматычнага факультэта БДУ чацвертакурснікі Антон Саўчанка і Андрэй Астроўскі, а таксама другакурснік Канстанцін Пашковіч.

За выдатныя поспехі ў навучанні, навуковай і грамадскай дзейнасці ўзнагароджаныя стыпендыяты прэзідэнцкага фонду — студэнты-пяцікурснікі Віктар Кахновіч (гістарычны факультэт), Вера Кудрашова (біялагічны факультэт), Юлія Лахвіч (факультэт філасофіі і сацыяльных навук), а таксама чацвертакурсніца Алена Рудэнка (факультэт міжнародных адносін).

**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА УНІВЕРСІТЭТА — РЫХТАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ НАШАЙ КРАІНЫ**

Інтэрв'ю з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Іванавічам СТРАЖАВЫМ

Стар. 2

**СУПЕРМЕН З ІНТЭРНАТА № 4**

Вынікі традыцыйнага конкурсу студгарадка

Стар. 4

**ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!**

## САЮЗ ЖАНЧЫН ЗАПРАШАЕ

***Саюз жанчын БДУ 4 сакавіка павіншуе жанчын з Жаночым днём. Свята пачнецца ў актавай зале філалагічнага факультэта ў 16.00 (вул. К. Маркса, 31).***

У праграме святкавання — сустрэча з касметолагам з медыцынскага цэнтра "Тэра-Медыка і К" Л.А. Турунок. Можна будзе атрымаць кансультацыю ў прадстаўнікоў фірмы "Здаровае харчаванне", а таксама ў прадстаўнікоў фабрык галаўных убораў "Людміла" і галантарэі "Галантэя". На святкаванні выступяць таксама кансультанты — менеджэры літаратурных навінак у суправаджэнні ансамбля аўтарскай песні (у складзе Уладзіміра Кодала, Алены Дзіхціеўскай, Алены Пілегінавай, Зоі Курук). Напрыканцы вечарыны кожную жанчыну чакае сюрпрыз.

## І ПАМЯТАЕ СВЕТ

У кожным падраздзяленні БДУ 17 сакавіка адбудзецца вечарына, прысвечаная 60-годдзю вызвалення савецкага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мерапрыемства пад дэвізам "І памятае свет выратаваны" арганізуе Саюз жанчын БДУ. Мяркуецца, што ўдзел у ім прымуць і студэнты, і супрацоўнікі — усе, хто любіць мастацтва (песні, музыку, паэзію, танцы).

Наталля КАСЬЯНЕНКА

**АСОБЫ**

## САМАЯ РАМАНТЫЧНАЯ З НАВУК

***Рэгіна Іосіфаўна ТЫШКЕВІЧ — доктар фізіка-матэматычных навук, адзіная жанчына-прафесар на механіка-матэматычным факультэце БДУ. Яна працуе на кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі. Заслужаны работнік народнай адукацыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, адна з вядучых спецыялістаў па тэорыі графаў у СНД — сур'ёзныя дасягненні, праўда? З гэтай незвычайнай жанчынай мы і сустрэліся напярэдадні 8 Сакавіка.***

**— Рэгіна Іосіфаўна, Вы скончылі механіка-матэматычны факультэт БДУ. Чаму Вы выбралі гэтую прафесію? Здаецца, матэматыка — не жаночая спецыяльнасць.**

— Кола інтарэсаў жанчын вельмі шырокае, абавязкаў у іх хапае. Сапраўды, мала жанчын, здольных дасягнуць пэўных поспехаў у вывучэнні матэматыкі. А я заўсёды ёю цікавілася: у мяне яшчэ ў школе быў выдатны настаўнік, які пераканаў мяне, што менавіта матэматыцы я павінна прысвяціць жыццё. Да таго ж, я па натуры сваёй рамантык, а матэматыка — самая рамантычная з навук. Тут трэба быць храбрай, мужнай, схільнай да авантураў асобай. Вы вывучаеце пэўны аб'ект, вам хочацца зразумець, як ён уладкаваны, а для гэтага трэба дзейнічаць, быць здольным адысці ад стандартаў мыслення, паглядзець на з'яву з іншага боку. У матэматыцы ўвесь час сутыкаешся з нечым новым, таямнічым, невядомым. Хіба гэта не рамантычна?

**— Вы працуеце ва універсітэце з 1956 г. — ужо амаль паўстагоддзя. Што зроблена за гэты час?**

— Пэўную лепту ў народную адукацыю ўдалося ўнесці. Кожны год мы выпускаем каля 350 матэматыкаў-тэарэтыкаў. Я выпусціла 9 падручнікаў, падрыхтавала 16 кандыдатаў навук і 1 доктара навук. Амаль усіх цяперашніх выкладчыкаў нашага факультэта вучыла я — калі не на практычных занятках, то лекцыі чытала, экзамены ў іх прымала.

**— Вам цікава са студэнтамі працаваць?**

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

# В.І. СТРАЖАЎ: «АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА УНІВЕРСІТЭТА — РЫХТАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ НАШАЙ КРАІНЫ»

*24 лютага ў БДУ адбылося пасяджэнне Вучонага савета, на якім пераважнай большасцю галасоў быў прыняты "Зварот да студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта". З просьбай пракаменціраваць сітуацыю мы звярнуліся да рэктара БДУ прафесара Васіля Іванавіча СТРАЖАВА.*



— Скліканне Вучонага савета адбылося па маёй ініцыятыве. І тлумачыцца яна проста і відавочна. З'яўляецца ў газеце пад гучнай назвай артыкул, у якім абвяшчаецца пра стварэнне нейкага грамадскага руху, мэты якога ні больш ні менш як ратаванне роднай Беларусі. Пад ім стаіць шэраг подпісаў нашых супрацоўнікаў, а першым — подпіс былога рэктара БДУ А.У. Казуліна, які абвясціў сябе каардынатарам новага руху. Складваецца ўражанне, што ўсё гэта — ініцыятыва менавіта калектыву універсітэта. Але, як высветлілася пазней, ні калектыў універсітэта, ні пераважная большасць тых, хто падпісаў, пра гэта не чулі і не ведалі. Таму я лічыў і ўпэўнены ў тым, што Вучоны савет павінен быў выказаць сваю пазіцыю. Адносна ж прыгожых лозунгаў стваральнікаў новага руху, адзначу: каб мець права на дэкларацыю высакародных мэтаў і выказваць прэтэнзіі стаць правадыром людзей, трэба мець за душой не толькі словы, але і высакародныя справы.

Я ўсцешаны, што члены Вучонага савета выказалі сваю нязгоду са спробамі ўцягнуць універсітэт у палітычныя гульні, ператварыць навучальную ўстанову ў "філіял" партыі ці грамадскай арганізацыі, якія ставяць на мэце дэстабілізацыю грамадскага жыцця.

**— У "Звароце" Вучонага савета гаворыцца пра падтрымку, якую аказвае кіраўніцтва нашай краіны БДУ ў развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы і сацыяльнай сферы. У чым канкрэтна гэта праяўляецца?**

— Мабыць, не ўсе ў поўнай меры ўсведамляюць, наколькі істотная падтрымка з боку дзяржавы, у свой час ініцыяваная Прэзідэнтам, аказваецца Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту. У сувязі з гэтым я хачу прывесці толькі некалькі прыкладаў: фонд заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага саставу БДУ ў 1,8 раза перавышае фонд заработнай платы, які выдзяляецца для аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага саставу ў іншых ВНУ. І ў гэтым годзе мы ўжо выйшлі на першае-другое месцы ў краіне па аплаце працы. Але ўзнікае пытанне, чаму ж не ў 1,8 раза вышэйшыя заробкі ў БДУ? Тлумачэнне гэтаму ёсць. Паколькі ва універсітэце вядзецца будаўніцтва, якое патрабуе шмат пазабюджэтных сродкаў, то значная частка грошай, якія зарабляе сам універсітэт, ідуць менавіта на гэтыя мэты, а не на аплату працы выкладчыкаў, як гэта практыкуецца ва ўсіх астатніх ВНУ. Нашыя выкладчыкі атрымліваюць толькі тыя грошы, якія выдаткоўваюцца з бюджэту (а гэта, нагадаю, у 1,8 раза больш, чым у астатніх ВНУ). Вось таму і выходзіць так, што мы, з аднаго боку, маем заробкі больш за іншых, але не ў 1,8 раза.

У сувязі з будаўніцтвам узгадаю факультэт міжнародных адносін, які пачалі ўзводзіць яшчэ да мяне. Агульны кошт гэтага аб'екта складае 13,5 мільёнаў еўра. Нам гэтыя грошы ніхто не падарыў. Аб'ект будуецца за кошт замежнага крэдыту, які ў значнай ступені будзе пагашацца дзяржавай, але універсітэт, згодна з узятымі на сябе абавязкамі, павінен будзе выдаткаваць каля 3,5 мільёнаў еўра са сваіх асабістых сродкаў.

Ці яшчэ. У мінулым годзе мы ўвялі ў эксплуатацыю гасцініцу па вул. Савецкай. Дагавор на гэтае будаўніцтва таксама быў заключаны пры мінулым рэктары. З асабістых сродкаў на гэтую будоўлю мы выплацілі каля 30 %, што склала амаль 2 мільярды рублёў. Але пры гэтым вельмі значная частка сродкаў укладаецца з боку дзяржавы. У мінулым годзе мы адрамантавалі інтэрнат № 2, які таксама каштаваў бюджэту каля 6 мільёнаў долараў. Ідзе рамонт у корпусе юрыдычнага факультэта, які абыдзецца каля 10 мільёнаў долараў. І гэта таксама фінансуецца дзяржавай. Спіс аб'ектаў, якія будуюцца і рамантуюцца ў БДУ, можна працягваць.

З 1998 года універсітэт атрымлівае столькі сродкаў на паляпшэнне сваёй матэрыяльнай базы, колькі дзяржава выдаткоўвае на ўсе ВНУ краіны, — а гэта вельмі значная падтрымка. Да таго ж, стыпендыя студэнтаў БДУ на 25 % вышэйшая за стыпендыі студэнтаў іншых ВНУ Беларусі.

**— У "Звароце" Вучонага савета гаворка ідзе не толькі пра падтрымку нашага універсітэта з боку дзяржавы, але і пра развіццё нацыянальнай культуры, адукацыі і навукі ва ўсёй краіне...**

— У гэтай сувязі хацелася б падкрэсліць, што на постсавецкай прасторы найбольшы працэнт ад валавага ўнутранага прадукту (ВУП) на развіццё навукі (які даходзіў, дарэчы, да 2,5 %) прыпадае на Рэспубліку Беларусь. Найбольшы працэнт ВУП, які выдзяляецца на адукацыю, таксама ў Беларусі. Тое ж самае можна сказаць і пра падтрымку развіцця нацыянальнай культуры. Дастаткова паглядзець на аб'екты, якія былі адрэстаўраваныя альбо пабудаваныя.

Падкрэслю, што на ўсёй постсавецкай прасторы менавіта Беларусь характарызуецца выразнай паслядоўнай палітыкай у інтарэсах сацыяльнай абароны ўсіх слаёў насельніцтва. Магу таксама сказаць, што на нашых вачах адбываецца рэальнае станаўленне маладой беларускай дзяржавы, якой раней ніколі не існавала ў беларускага народа.

І гэта ўсё стала магчымым яшчэ і таму, што Рэспубліка Беларусь — адзіная дзяржава на постсавецкай прасторы (а можа нават і на постсацыялістычнай, за выключэннем, мабыць, Чэхіі), дзе не праводзілася дэіндустрыялізацыя. Усе астатнія постсавецкія рэспублікі, уключаючы Расію, гэты працэс закрануў. А ён азначае масавае закрыццё прамысловых прадпрыемстваў і значнае памяншэнне эканамічнага патэнцыялу. Падругое, на цяперашні час у Беларусі, у адрозненне ад іншых краін постсавецкай прасторы, гэтая ўласнасць у значнай ступені з'яўляецца па-ранейшаму агульнанароднай. У нас не адбылося такой дзікай прыватызацыі, якая была ў іншых рэспубліках былога Савецкага Саюза.

**— Але ж у Беларусі, нягледзячы на ўсе перавагі ў параўнанні з іншымі постсавецкімі краінамі, вельмі шмат яшчэ нявырашаных праблем...**

— Натуральна, што праблемы існуюць у кожнага арганізма, які развіваецца, жыве. Праблем няма ў арганізма, які ўжо памёр. Хачу прывесці прыклад. Калі вы возьмеце лупу і пачнеце праз яе разглядаць карціну Рэмбранта, то вас уразіць пабачанае. І калі разглядаць карціну толькі праз лупу, то цяжка ўявіць, якая яна ўвогуле. Так і некаторыя людзі, якія прэтэндуюць на ацэнку сітуацыі, становяцца падобнымі да чалавека з лупай, які вывучае з ёю вялікі твор мастацтва. Адпаведна — з апісаннем усяго таго, што ён бачыць.

**— У некаторых СМІ з'явілася інфармацыя пра масавыя звальненні супрацоўнікаў БДУ, чые подпісы з'явіліся пад гэтым зваротам...**

— Большасць з тых, хто падпісаўся, у гутарцы са мною заявілі, што былі ўведзены ў зман наконт сапраўдных мэтаў стварэння новай арганізацыі. Амаль усе яны знялі свае подпісы. І як працавалі ў БДУ, так і працуюць.

Але сапраўды, 21 лютага былі вызвалены ад пасад дырэктар студгарадка Павел Міхайлавіч Бычкоўскі і начальнік упраўлення па міжнародных сувязях БДУ Аляксандр Мікалаевіч Рухля.

Што тычыцца П.М. Бычкоўскага, то варта зазначыць, што прэтэнзіі да яго фінансава-гаспадарчай дзейнасці ўзніклі ў рэктарацце яшчэ мінулай вясной. У сувязі з гэтым кантракт з ім не заключаўся да ліпеня. Пасля кантракт з ім быў заключаны толькі на год, прычым з папярэджаннем пра недапушчальнасць парушэння фінансава-гаспадарчай дысцыпліны. Аднак парушэнне паўтарылася. І якраз 21 лютага П.М. Бычкоўскага і павінны былі вызваліць ад займанай пасады.

Калі казаць пра А.М. Рухлю, то яшчэ некалькі месяцаў таму было вырашана, каб ён шукаў сабе іншую працу: гэта было звязана з маёй незадаволенасцю яго працай як начальніка ўпраўлення. І калі 21 лютага ён спытаў у мяне, ці сыходзіць яму з працы, я адказаў пытаннем: як ён сам лічыць? Ён сказаў, што трэба сыходзіць. Такім чынам, з узаемнай згоды бакоў ён і пакінуў БДУ. І не было ніякіх ультыматумаў, што калі ён, напрыклад, адмовіцца ад подпісу, то захавае сваю пасаду — пра гэта ўвогуле не было гаворкі.

Тое ж адбылося і з П.М. Бычкоўскім, які, дарэчы, свой подпіс зняў.

Што ж тычыцца, напрыклад, Алега Антонавіча Лойкі (дарэчы, 1931 года нараджэння), ён, як і раней, пакуль працуе ў нас на палову стаўкі. Аляксандр Аляксандравіч Пашкевіч таксама ўсё яшчэ працуе ў нас дацэнтам.

**— Васіль Іванавіч, на Вашу думку, ці маюць права супрацоўнікі і студэнты БДУ выказваць уласныя меркаванні наконт актуальных праблем развіцця нашага грамадства?**

— Натуральна, што такое права мае кожны чалавек. І ніхто яго не можа пазбавіць гэтага права. І выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю можна падчас галасавання, на выбарах... Я ўпэўнены, што асноўная задача універсітэта была, ёсць і застаецца адна: рыхтаваць будучыню нашай краіны. Нездарма ж гаворыцца, што наш універсітэт — гэта сапраўдны флагман вышэйшай школы, таму што ён падмурак нацыянальнай культуры, адукацыі і навукі. І тыя задачы, якія сёння стаяць перад БДУ — як у плане развіцця, так і ў плане абнаўлення навучальна-выхаваўчага працэсу, вываду яго на сучасны ўзровень, — можна вырашыць толькі ў тым выпадку, калі універсітэт будзе працаваць стабільна, добра і якасна. І гэта будзе ўласціва ўсім — як прафесарска-выкладчыцкаму саставу, так і іншым супрацоўнікам. А студэнты старannай вучобай ствараюць не толькі будучыню нашай краіны, але і сваю будучыню.

**Гутарыла**
**Тацццяна КУХАРЧУК**

## ЗВАРОТ ДА СТУДЭНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

У сувязі з падзеямі вакол так званага "Звароту да беларускага народа" і палітычнай актыўнасцю былога рэктара БДУ А.У. Казуліна Вучоны савет рашуча асуджае спробы ўцягнуць імя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў палітычныя гульні і інтрыгі.

Мы таксама катэгарычна супраць спробаў ператварыць адукацыйную ўстанову ў "філіял" любога палітычнага руху ці грамадскай арганізацыі, якія ставяць сваёй фактычнай мэтай дыскрэдытацыю дасягненняў беларускага грамадства.

Вучоны савет падтрымлівае палітыку дзяржавы, накіраваную на абарону інтарэсаў усіх слаёў насельніцтва, развіццё нацыянальнай культуры, адукацыі і навукі, умацаванне суверэнітэту Беларусі.

Мы ўдзячныя за тую важкую падтрымку, якую аказвае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка і ўрад краіны Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту ў развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы і сацыяльнай сферы ВНУ, у паляпшэнні дабрабыту студэнцтва і прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта.

Мы перакананыя ў тым, што трыццацітысячны калектыў супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ будзе і надалей актыўна ўдзельнічаць у пераўтварэннях, якія ажыццяўляюцца ва універсітэце і краіне, творчай працай спрыяючы далейшаму развіццю роднай ВНУ на карысць моцнай і квітнеючай Беларусі.

**Прыняты на пасяджэнні**
**Вучонага савета БДУ 24 лютага 2005 года**

ДА 60-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

# АДСВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

*У рамках святкавання 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і з нагоды Дня абаронцаў Айчыны 23 лютага ў БДУ адбыўся круглы стол "Подзвіг народа ў вайне як фактар фарміравання нацыянальнай самасвядомасці".*

Удзел у ім узялі ветэраны вайны, воіны-інтэрнацыяналісты, выкладчыкі і студэнты.

Паколькі сёлета для студэнтаў уводзіцца новы курс лекцый "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны", то на круглым стале абмяркоўваліся тэмы будучага курса.





Да святкавання 60-годдзя Перамогі ў нашым універсітэце быў падрыхтаваны падручнік "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне", які быў прадстаўлены на сустрэчы. Распрацаваны ён студэнтамі і выкладчыкамі гістарычнага факультэта БДУ. У яго ўвайшлі артыкулы і дакументы ваеннай тэматыкі, фотаальбом і тэсты, карты, інтэрв'ю з удзельнікамі вайны, запісы ваенных песень і інш.

Павіншавалі вэтэранаў творчыя калектывы БДУ. Скончылася сустрэча ўскладаннем вянка да помніка ва універсітэцкім дворыку і ўрачыстым маршам курсантаў ваеннага факультэта нашага універсітэта.

**Юлія ПАПОВА**
**Фотаздымкі аўтара**

СПОРТ

## ПІНГ-ПОНГ ПА-ІНТЭРНАЦКУ

*Спаборніцтвы па настольным тэнісе паміж камандамі інтэрнатаў БДУ адбыліся 21 лютага ў спартыўнай зале філалагічнага факультэта. Аматары пінг-понгу сабраліся, каб вызначыць мацнейшага.*

На працягу вечара спартсмены змагаліся за права называцца лепшымі. Удалося гэта зборнай інтэрната № 4. Вадзім Навумік (IV курс, ФМА), Андрэй Козел (III курс, юрфак), Андрэй Грыбло (III курс, ФМА) і Таццяна Чэрвідас (II курс, юрфак) сталі пераможцамі ў складзе гэтай каманды. Другім месцам можа ганарыцца інтэрнат № 2. "Срэбра" для сваёй зборнай дабывалі Яўген Муцянка (II курс, геафак), Андрэй Ляхновіч (II курс, геафак) і Алена Дзяшкевіч (III курс, геафак). Замыкае прызавую тройку каманда інтэрната №7. У яе склад уваходзілі Валянцін Зобаў (IV курс, ММФ), Кірыла Сінкевічус (II курс, ММФ) і Надзея Бышко (II курс, філфак).

**Аляксандр САЛАМАХІН**

## ТУРНІР ПА БОЎЛІНГУ

Турнір па боўлінгу на прызы камітэта БРСМ БДУ сярод студэнтаў і маладых супрацоўнікаў нашага універсітэта адбыўся 1 сакавіка на базе боўлінг-клуба "Play Ball". Арганізатарамі мерапрыемства, акрамя камітэта БРСМ БДУ, выступіла таксама ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю. З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся прарэктар БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў.

Усяго ў турніры прынялі ўдзел 10 каманд. Перамагла ў спаборніцтвах каманда інтэлектуальнага клуба "Агх". Для нашага універсітэта гэты турнір па боўлінгу быў першым. Але ёсць надзея, што ён стане традыцыйным.

**Аляксандр ЛЯНКЕВІЧ**

АФІЦЫЙНА

## НОВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

Доктар фізіка-матэматычных навук **Таццяна Аляксееўна ДЗІК** прызначана намеснікам па навуковай рабоце першага прарэктара, начальнікам Галоўнага ўпраўлення навукі.

•••••••••

Кандыдат хімічных навук **Міхаіл Барысавіч ЧАРАПЕННІКАЎ** прызначаны дырэктарам студэнцкага гарадка — намеснікам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ЕЎРАПЕЙСКАЯ ШКОЛА Ў ВАРШАВЕ

*У рамках праекта "Еўрасаюз пасля ўваходжання краін Цэнтральнай Еўропы" ў чэрвені адбудзецца міжнародная летняя еўрапейская школа (21 дзень) у Варшаве і "Еўрарэйс" (8 дзён).*

Праект разлічаны на маладых навукоўцаў, выкладчыкаў, грамадскіх работнікаў краін "новага суседства" з Беларусі, Украіны, Малдовы.

Летняя школа разлічана на 47 удзельнікаў. Кошт удзелу для кожнага прэтэндэнта — 350 еўра, астатняя сума выдаткаў кладзецца на Еўрасаюз і ВШМ ОПІ.

Загадзя прадастаўленыя заяўкі прадугледжваюць бесплатнае адкрыццё віз — **да 15 сакавіка 2005 г.**

Дэтальную інфармацыю можна атрымаць па мабільным тэлефоне 8-067-910-27-21 (ва Украіне), а таксама ў аддзеле міжнародных адносін Ровенскага інстытута славяназнаўства КСУ. Заяўкі можна дасылаць электроннай поштай (interoffice@ukr.net).

**Па інфармацыі ўпраўлення па міжнародных сувязях**

АСОБЫ

# САМАЯ РАМАНТЫЧНАЯ З НАВУК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Студэнтаў я вельмі люблю, нават "хвасцістых". (*Смяецца.*) Не стамлюся паўтараць, што студэнт не ёмістасць, якую трэба напоўніць, а паходня, якую трэба запаліць. Так хочацца данесці ім тое, што ведаеш, абудзіць прагу да навукі. Між іншым, у іх таксама ёсць чаму павучыцца: жыццярадаснасці, храбрасці. Дзякуючы пытанням, якія яны ставяць перада мной, з'яўляецца магчымасць па-іншаму зірнуць на той ці іншы аб'ект, убачыць нам вярнуць яго іншай гранню. Адказамі на мае пытанні яны вучаць мяне лепей выкладаць матэрыял. Але не хацелася б перайначыць у іх усялякія дзіўныя словы. Вось нядаўна студэнтка, даказаўшы тэарэму, раптам кажа: "Прыкольная тэарэма".

**— Рэгіна Іосіфаўна, Вы строгі выкладчык?**

— З гадамі строгасці становіцца ўсё менш — наадварот, неяк імкнешся сваіх навучэнцаў ахоўваць... Думаеш: "А можа, ён галодны?" А вось тая дзяўчына з задумлівым позіркам, напэўна, закахалася. Адразу неяк сэрца мякчэе. Я ўвогуле лічу, што мы, выкладчыкі, часта даем студэнтам празмерна многа нейкай другараднай, дадатковай інфармацыі, якая ім і не спатрэбіцца нават. Яно, мабыць, і нядрэнна, але ж гэты баласт пазбаўляе магчымасці думаць свабодна.

**— А любімчыкі ў Вас ёсць?**

— Усе, каму дапамагала працаваць над дысертацыямі, — мае любімчыкі. Мы з імі пачыналі сябраваць з першага курса. Ведаеце, сумесныя заняткі навукай — працэс вельмі інтымны: навукоўцы павінны стаць сябрамі, каб працаваць разам. Інакш у іх нічога не атрымаецца.

**— Ці былі ў Вашай навуковай практыцы такія моманты, што Вы раптам адчулі: прыйшло натхненне?!**

— Гэта ўсё казкі. Калі навукоўца ўсвядоміў нешта, чаго не разумеў раней, то гэта — дзякуючы доўгай сістэматычнай працы. Думаеш увесь час: і калі бульбу абіраеш, і калі ў транспарце едзеш, і калі ў краме ў чарзе стаіш. Калі нарэшце дадумаўся да чагосьці — вось гэта сапраўднае шчасце!

**— Кажуць, разумнай, таленавітай, актыўнай жанчыне ў жыцці некалі даводзіцца рабіць выбар паміж сям'ёй і кар'ерай...**



— Сапраўды... Тым больш, што матэматыка, як вы сказалі, — нежаночая спецыяльнасць. Я не змагла б абараніць доктарскую, не дасягнула б поспехаў у вывучэнні матэматыкі, калі б на пэўным этапе жыцця выхаваннем маёй дачкі не занялася яе бабуля. Часта адчуваеш пэўную незадаволенасць сабой як гаспадыняй. Даводзіцца выбіраць... Сваю дачку я хацела пазбавіць усіх цяжкасцей гэтага выбару. Мы з мужам (ён таксама матэматык) рабілі ўсё магчымае, каб яна не стала матэматыкам. Я марыла, што мая дачка будзе вучыцца ў лінгвістычным універсітэце — здаецца, для жанчыны лепшай прафесіі няма, але гены бяруць сваё: дачка таксама матэматык. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, я ні кроплі не шкадую, бо самая рамантычная з навук таго вартая. Ведаеце, калі б усе людзі даведаліся, наколькі матэматыка цудоўная, гэта была б катастрофа, бо не засталося б іншых спецыялістаў: усе б займаліся матэматыкай! Для гэтага патрэбна неверагодная апантанасць. У мяне яна ёсць: матэматыка для мяне і праца, і хобі, і найвялікшае захапленне.

**— Як Вы ўсё паспяваеце?**

— Нічога не паспяваю! Усё жыццё паводле графіку, усё распісана па хвілінах. Але хацелася б паспяваць значна больш! Задумак і планаў — вялікае мноства, паспець бы толькі здзейсніць. Вельмі хачу выпусціць падручнік, прысвечаны тэме матроідаў і графаў. Пакуль што гэта толькі ідэя.

**— Рэгіна Іосіфаўна, што б Вы пажадалі ўсім дзяўчатам і жанчынам напярэдадні свята?**

— Нічога не баяцца: боязь — дрэнны дарадца і ў жыцці, і ў навуцы. Варта скарыстаць пачуццё гумару і цвярозы розум — і знойдзеце выйсце з любой сітуацыі.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

АБ'ЯВЫ

## ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Лабараторыя гама-оптыкі
Вядучы навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*А.В.Сидоренко.* **Основы энергосбережения.** У курсе лекцый разглядаюцца асноўныя паняцці, тэрміны і вызначэнні энергазахавання, асвятляюцца праблемы энергетыкі Беларусі.

*В.Т. Ерофеенко, И.С. Козловская.* **Математические модели в электродинамике. В 2 ч. Ч. 1.** У выданні выкладзены курс лекцый па электрадынаміцы на аснове матэматычнага фармалізму.

*А.С. Назаров.* **Фотограмметрия.** Курс лекцый падае тэорыю фотаграмметрыі і прымяненне яе для стварэння тапаграфічных картаў, планаў. Выкладаюцца таксама пытанні выкарыстання матэрыялаў аэрафотаздымак у якасці тапаграфічнай асновы геаінфармацыйных і кадастравых сістэм.

*Т.И. Макарова.* **Эколого-правовой статус граждан Республики Беларусь.** Манаграфія прысвячаецца праблемам прававога становішча чалавека ва ўзаемадзеянні з навакольным асяроддзем.

*Л.Е. Тихонова.* **Демография Беларуси.** У навучальным дапа-




можніку з грыфам Міністэрства адукацыі разглядаюцца агульныя пытанні дэмаграфічнага развіцця Беларусі. Выкладаюцца напрамкі дзяржаўнага рэгулявання дэмаграфічнага развіцця, а таксама тэарэтыка-метадалагічныя асновы аналізу дэмаграфічнай бяспекі Беларусі.

*С.И. Лебединский, Г.Г. Гончар.* **Русский язык как иностранный.** Падручнік, рэкамендаваны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, адрасуецца замежным студэнтам, якія валодаюць рускай мовай на базавым (камунікатыўна неабходным і камунікатыўна дастатковым) узроўні, прынятым у беларускай, расійскай і міжнароднай класіфікацыях.

**Немецко-русский толковый словарь экономических терминов.** *Авторы-составители М.А. Черкасс, Т.В. Лавшук.* Слоўнік змяшчае ключавыя паняцці і тэрміны па эканоміцы: кіраванне прадпрыемствам (планаванне і арганізацыя), маркетынг, фінансаванне і ўлік.

**История восточных славян с древнейших времен до начала XVII в.** *Автор-составитель С.Б. Жарко.* Навучальна-метадычны комплекс прызначаны для забеспячэння самастойнай работы студэнтаў па аднайменным курсе.

*А.А. Кулешов.* **Уравнения математической физики в системе Mathematica.** У навучальным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі разглядаюцца асноўныя метады рашэння ўраўненняў матэматычнай фізікі.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# СПЯВАЙЦЕ ЧАСЦЕЙ!

***Людміла Іванаўна МУРАЧОВА, намесніца начальніка ўпраўлення па справах культуры, — жанчына, якая займае адказную і, адначасова, цікавую пасаду. Яна кіруе рэпетыцыямі жаночага студэнцкага вакальнага ансамбля.***

**— Як з'явілася ідэя такога ансамбля?**

— Сама ідэя ўзнікла зусім нядаўна — у лістападзе мінулага года, пасля праслухоўвання салістаў-вакалістаў у вакальную эстрадную студыю БДУ. Вядома, кіраўнік гэтай студыі, кампазітар Леанід Шырын, пад час кастынгу знайшоў для сябе найлепшых спевакоў. Са свайго боку, я прапанавала ўсім астатнім пасупрацоўнічаць (каб не марнелі таленты).

**— Чые песні вы выконваеце? На кім апрабоўваеце "першыя крокі"?**

— Калектыў, які спявае чужыя, ужо вядомыя песні, зусім не цікава слухаць. Канешне, можна змяніць музычную апрацоўку, але ж гэта зусім не тое. Таму мы звярнуліся да Леаніда Шырына. Ён піша для нас новыя песні, альбо мы спяваем нешта, што яшчэ не гучала нідзе. Пры патрэбе Шырын робіць для нас і "мінусоўкі" (раз'ядноўвае музыку і словы).

**— Хто займаецца ў ансамблі?**

— Цяпер у нас толькі дзяўчаты. Напрыканцы апошняга семестра іх было 12 — для ансамбля гэта вельмі вялікая колькасць удзельнікаў. Мы клікалі ўсіх, але хлопцы, якіх набіралі яшчэ для фальклорнага ансамбля, сыходзілі ад нас, бо ім не падабалася: "Народныя песні — гэта не наша". Хаця, шчыра кажучы, мы звычайна развучваем даволі шпаркія творы.

**— Ці ёсць у калектыву назва?**

— Не, мы пакуль лічымся "маленькімі": паводле правілаў, імя калектыву даецца пасля прысваення звання "народны". А да яго — працаваць цэлых 5 гадоў.

**— Што павінны мець дзяўчаты ў вашым калектыве?**

— Па-першае, сярод іх якасцей павінна быць чыстае інтанаванне гуку. Па-другое, добрая музычная памяць і гарманічны слых (уменне спяваць разам).

**— Што б Вы пажадалі напярэдадні жаночага свята?**

— Добрага настрою і жадання спяваць. Спевы — гэта радасць, добрая маральная падтрымка. Спявайце часцей!

**Гутарыла Алёна КРЫЎКІНА**

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# СУПЕРМЕН З ІНТЭРНАТА № 4

У традыцыйным шоу-конкурсе "Супермен—2005" 24 лютага прынялі ўдзел 9 хлопцаў (па адным прадстаўніку ад кожнага інтэрната). Самага вартага з іх выбірала жаночае журы з адміністрацыі студгарадка пад кіраўніцтвам новага дырэктара — М.Б. Чарапеннікава.

Удзельнікі маглі праявіць сябе ў 4 конкурсах: візітная картка, творчасць, прызнанне ў каханні, аэробіка. Сваю вынаходлівасць, пачуццё гумару і талент удзельнікі найбольш яскрава паказалі менавіта ў творчым конкурсе. Прэтэндэнты на званне "Супермен—2005" і танчылі, і спявалі, і вершы чыталі, і светлавое шоу паказвалі, і сатырычныя пародыі, і нават інтэрмедыі. Самым арыгінальным нумарам гэтага конкурсу стаў "антыстрыптыз", які паказаў разам са сваім асістэнтам Сяргей Івановускі з інтэрната № 7. Чаму "анты"? Бо на сцэне хлопцы не распраналіся, а... апраналіся — з плавак у касцюмы ды гальштукі.



Сваю рамантычнасць удзельнікі выяўлялі ў 3-м конкурсе — прызнанне ў каханні. Самым шчырым падалося прызнанне Уладзіміра Казанкова з інтэрната № 10. У той час, як ён расказваў гісторыю свайго кахання, адбывалася інсцэніроўка яго аповеду. А потым у фінале нечакана для гледачоў і нібыта для самога Вовы на сцэне з'явілася яго каханая, і абодва яны апынуліся пад дажджом з пялёсткаў руж.

Па выніках конкурсаў журы прысудзіла званне "Містэр—2005" (пачэснае 2-е месца) У. Казанкову. Было таксама абвешчана, што сімпатыі гледачоў на баку Віталя Апаленіса з інтэрната № 1. Ён атрымаў прыз ад к/т "Цэнтральны": 2 білеты на любы сеанс.

А пераможцам стаў Уладзімір Басько — прадстаўнік інтэрната № 4. Ён найбольш запомніўся прачулым выкананнем уласнага верша на ваенную тэматыку. Гэта не адзіная перамога Уладзіміра: ён таксама быў прызнаны лепшым выканаўцам на фестывалі студэнцкай песні "Сярэбраныя струны". Пажадаем поспехаў узыходзячай зорцы студгарадка!

**Ала МАЧАЛАВА**

**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

СВЯТЫ

# МІМОЗЫ ДЛЯ КАХАНАЙ

У савецкі час мужчыны жадалі дарыць кветкі жанчынам на 8 Сакавіка, жадалі, але найчасцей не мелі магчымасці. У наш час гэта гучыць жудасна, але тады мужчыны падымаліся каля 5—6 гадзін раніцы, каб паспець набыць маці, бабулі, сястры, жонцы або дачцэ хаця б галінку сціплых, але доўгачаканых кветак — тую ж мімозу.

А што сёння? Я пытаюся ў дзяўчат у адзін з апошніх зімовых дзён, калі яшчэ ідзе снег, а кветкі прадаюцца толькі ў пераходах.

**Надзея (II курс хімфака):** Апошні раз мне дарылі кветкі, намаляваныя на паштоўцы. Гэта былі ружы... З жывых і веснавых мне вельмі падабаюцца мімозы і цюльпаны.

**Таццяна (I курс ФМА):** На мінулае свята 8 Сакавіка мне падарылі белыя ружы. Мімозы мне ніколі не падабаліся.

**Яўгенія (I курс ФМА):** Мне кветак ніхто не дарыў, таму што ўсе ведаюць, што мне кветкі зусім не падабаюцца.

**Ганна (I курс журфака):** Упершыню мне падарылі мімозы на мінулае 8 Сакавіка. Я іх тады ўпершыню ўбачыла не на малюнку.

Мімоза, вядома, не параўнаецца ў грацыёзнасці з ружамі, у вытанчанасці — з цюльпанамі, у грандыёзнасці — з дарагімі зборнымі букетамі. Але ўсё адно яна застаецца абавязковым атрыбутам Жаночага дня.

З першым веснавым і ўласна жаночым святам віншую дзяўчат і жанчын! А мужчынам раю паспяшацца набыць сваім жанчынам кветкі — хаця б мімозы.

**Валерыя СТАСЮК**

АБ'ЯВЫ

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

***запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў сакавіку-маі 2005 г. выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:***

**1.** Псіхалагічная гатоўнасць выкладчыкаў да работы з адоранай асобай (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, СШ і інш.) — **14.03—26.03;**

**2.** Ідэалагічныя і выхаваўчыя асновы выкладання рускай літаратуры (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ,СШ) — **14.03—26.03;**

**3.** Беларуская нацыянальная культура на мяжы стагоддзяў (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — **21.03—26.03;**

**4.** Карупцыя і яе грамадская небяспека (для супрацоўнікаў і выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — **21.03—02.04;**

**5.** Нацыянальная ідэя і патрыятызм у навучанні беларускай мове і літаратуры (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — **28.03—09.04;**

**6.** Міжнародны менеджмент у кантэксце адукацыйнай дзейнасці сучаснай ВНУ (для адміністрацыйна-кіраўніцкага саставу ВНУ) — **28.03—01.04;**

**7.** Кіраванне адукацыйнымі ўстановамі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (для рэзерву прарэктараў ВНУ) — **04.04—08.04;**

**8.** Філасофскія і сацыяльна-культурныя праблемы глабалізацыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — **04.04—15.04;**

**9.** Кіраванне адукацыйнымі ўстановамі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (для рэзерву дэканаў, намеснікаў дэканаў факультэтаў) — **18.04—22.04;**

**10.** Тэорыя і методыка навучання гісторыі ва ўмовах мадэрнізацыі адукацыйнай сістэмы (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — **18.04—30.04;**

**11.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў забеспячэнні і выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — 1-ы этап: **25.04—30.04;**

**12.** Арганізацыя навучальна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ (для загадчыкаў і метадыстаў вучэбна-метадычных аддзелаў ВНУ) — **16.05—27.05;**

**13.** Актыўныя метады навучання ў вышэйшай школе (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — **30.05—11.06.**

Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 *для папярэдняга запісу ў групы.*

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, 320, тэл./факс 200-25-51**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

4 сакавіка 2005 года
Падпісана да друку 3.03.2005 г.
Зак. 249. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by